Николай ТУРЧЕНКО, ветеран труда, кандидат технических наук, доцент.

Минск.

ФАКТ



Беларусь прадала ў Паўночную Карэю тры трактары

На 20,2% скарочаны пастаўкі нашых «Беларусаў» у Расію, на 43,4% – у Казахстан.

Многія заўважылі: у той час, калі каля прахадной Мінскага трактарнага завода адкрывалі адрэстаўраваны помнік Леніну, на складах прадпрыемства сабралася шмат нерэалізаванай тэхнікі.

І вось Белстат апублікаваў вынікі працы Мінскага трактарнага завода за тры кварталы гэтага года. Першыя высновы: спрацаваць лепш ці нават таксама, як у 2015 годзе, у завода наўрад ці атрымаецца. Паводле вынікаў дзевяці месяцаў, экспарт МТЗ на 2,2% ніжэй за мінулагодні паказчык у натуральным выражэнні і на 2,4% – у вартасным.

Так, высветлілася, што Расія, на рынак якой усе гэтыя гады рабілі стаўку нашы вытворцы, скараціла імпарт беларускіх трактароў на 20,2%! Значна менш, чым у мінулым годзе, купіў трактароў яшчэ адзін наш партнёр па Мытным саюзе – Казахстан: ажно на 43,4%. Толькі дзякуючы павелічэнню продажаў ва Украіну, Азербайджан і Малдову Мінскаму трактарнаму ўдалося перакрыць страты, якія ўтварыліся пасля гэтага правалу на рынках "мытных саюзнікаў".

У выніку за дзевяць месяцаў гэтага года ў краіны СНД МТЗ паставіў 5173 трактары. А ўвесь экспарт завода склаў 20.985 машын на суму 304,84 млн долараў. Самыя маленькія пастаўкі Мінскі трактарны ажыццявіў у Паўночную Карэю (туды было прададзена тры трактары) і ў Нарвегію, якая набыла шэсць «Беларусаў».

Цікава, а колькі ўсяго трактароў вырабляе МТЗ у год? Вось дадзеныя за некалькі апошніх гадоў:

2011 год – выраблена 59,1 тысячы штук тэхнікі,
2012 – 70,1 тыс.
2013 – 62,6 тыс.
2014 – 45,2 тыс.
2015 – 34,3 тыс. штук.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ЗАПРАШЭННЕ

Святлана Алексіевіч адкрывае інтэлектуальны клуб

Першая сустрэча адбудзецца 7 снежня ў галерэі TUT.BY. У якасці госці з лекцыяй «Зло» ў Мінск прыедзе расійская паэтка, празаік, перакладчык, філолаг і этнограф ***Вольга Седакова.***

Святлана Алексіевіч кажа, што не ведае роўных Седаковай сярод сучасных рускіх інтэлектуалаў.

– *У Вольгі вельмі дакладны маральны нюх, яна ўмее раней за іншых фармуляваць думкі і прагназаваць будучыню*, – цытуе tut.by Алексіевіч. – *Яшчэ гадоў 10 таму яна арганізавала лекцыю «Пасрэднасць як сацыяльная небяспека», дзе ўжо тады прадказала і пуцінізм, і тое, што наверх вылезе ашуканы і разззлаваны маленькі чалавек. А вінаваты ў гэтым будуць дэмакраты.*

Сустрэчы ў інтэлектуальным клубе будуць праходзіць кожны месяц. Святлана Алексіевіч абяцае, што "прахадных" гасцей не будзе. Сярод іншых нобелеўскі лаўрэат абяцае прывезці ў Мінск рэжысёра **Аляксандра Сакурава,** палітыка і грамадскага дзеяча Расіі **Ірыну Хакамаду,** вучонага-псіхалінгвіста **Таццяну Чарнігаўскую.**

– *Мы будзем трымацца вельмі высокай планкі,* – абяцае Святлана Алексіевіч.

Нобелеўскі лаўрэат прызнаецца, што адкрыццё клуба – нятаннае задавальненне, таму што ўсе госці атрымліваюць высокі ганарар. А бясплатна спікеры такога ўзроўню выступаюць рэдка.

– *Вельмі важна падняць размову на высокую планку. Я на першай жа сустрэчы папрашу, каб у клубе не было ніякай палітычнай мітынговасці. Так мы нічога не даб'ёмся. Важней убачыць глыбінныя праблемы і намацаць той падмурак, які дапаможа разумнаму чалавеку выжыць. А такія людзі ў нас ёсць, але ў апошні час інтэлектуалы адчуваюць сябе маргіналамі,* – сказала пісьменніца.

Паведамляецца, што лекцыі будуць бясплатныя для слухачоў, адзіная ўмова ўдзелу – загадзя зарэгістравацца на мерапрыемства. Аб рэгістрацыі будзе паведамлена дадаткова.

ШОУ-БІЗНЕС

На дзіцячым «Еўрабачанні-2016» Беларусь заняла сёмае месца

Пераможцай стала 10-гадовая Марыям Мамадашвілі з Грузіі з кампазіцыяй Mzeo.



Грузіі для перамогі спатрэбілася 239 балаў. Другое месца занялі Анаіт Адамян і Мэры Варданян з Арменіі – 232 балы, трэцяе – Фіама Бочэ з Італіі (209 балаў).

Беларусь прадстаўляў 12-гадовы Аляксандр Мінёнак, які набраў на конкурсе 177 балаў.

Хлопец вельмі адказна рыхтаваўся да "Еўрабачання".

"*У верасні я ў школу не хадзіў – не было часу*, – распавёў Аляксандр на сваёй прэс-канферэнцыі перад конкурсам. – *Але ў звычайныя дні я ўздымаюся ў восем раніцы, іду ў школу, потым – на вакал і танцы. Стараюся ўсё паспець. Урокі раблю дома, вучуся даволі добра. А для здымак, якія я вельмі люблю, ёсць выхадныя*"

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

Даць ім пад адно месца…



Не, не выпадкова ў апошні час да нас у Мінск патокам хлынулі адмёныя асобы з Расіі. Вось і 25 лістапада чакаецца сустрэча ў Палацы Рэспублікі з кім вы думаеце… з тым самым Уладзімірам Салаўёвым, якога даўно называюць палітычным тэлекілерам. Хто хоць адзін раз паглядзеў яго шоу пад назвамі "К барьеру", «Поединок», «Вечер с Соловьевым», запомніў заангажаванасць вядучага, нахрапістасць у адстойванні імперскіх поглядаў, напады на нашу суседку Украіну.

Не сакрэт: на інфармацыйную вайну Расія выдаткоўвае велізарныя грошы. Крамлём створаныя спецыяльныя службы з мэтай уплыву на свядомасць грамадзян як сваёй краіны, так і краін, што ўваходзяць у кола геапалітычных інтарэсаў Расіі. Так, на дзяржавы Заходняй Еўропы скіравана дзейнасць холдынга "RUSSIA TODAY", на Беларусь – холдынга "Спутник". Да службы ў гэтых і іншых падобных структурах прыцягваюцца спрактыкаваныя прафесіяналы, адэпты шавіністаў. Не апошняе месца ў гэтай арміі маніпулятараў грамадскай думкай займае У.Салаўёў.

Праграмы Уладзіміра Салаўёва належаць да такой журналістыкі, дзе свабода слова выкарыстоўваецца ў першую чаргу для распаўсюджвання дэзінфармацыі, а сама журналістыка падмяняецца прапагандай варожасці, гвалту, фактычна робіцца рупарам праўладных расійскіх ідэолагаў.

У рэчышчы выступлення У.Пуціна на апошнім Валдайскім форуме салаўёўская прапаганда ідзе далей: "Украина не существует сама по себе. Она существует только в рамках «русского мира», «Россия – преемница не только Российской империи и Советского Союза, но и Киевской Руси», «Киев – мать городов русских. Не пора ли вернуть русский город?» («К барьеру», 13 кастрычніка).

Літаральна ва ўсіх перадачах У.Салаўёва, прысвечаных процістаянню з Украінай, незалежнай дзяржавай, прызнанай усім светам, ужываецца той слэнг: кіеўская хунта, бандэраўская сволач, фашысцкая ўлада і г.д. Вось выразы, агучаныя ў праграме "Вечер с Соловьевым" 28 верасня: "На Украине ваша бандеровская сволочь не победит. Ваша власть – наследники фашистов (Сатаноўскі), «Народ сметет фашистскую сволочь» (Железняк), «Дипломатия должна быть вторичной, военные успехи наши – первичны» (Багдасараў), «Никогда на территории бывшего СССР нацистская сволочь не победит» (Салаўёў).

Каментаваць рыторыку ўдзельнікаў гэтак званых дыскусій залішне. Яны гавораць самі за сябе.

Паводле законаў журналістыкі, У.Салаўёў як вядучы і інтэрв'юер павінен прытрымлівацца нейтральнай пазіцыі, разглядаць розныя пункты гледжання праблемы, аб'ектыўна і справядліва даваць адзнакі падзеям і фактам, якія абмяркоўваюцца ўдзельнікамі перадачы. Але яго эфір сведчыць аб процілеглым. Чалавек, які выказвае ўласную думку, што не супадае з меркаваннем вядучага, трапляе пад "шквальны абстрэл" абсалютнай большасці падабраных удзельнікаў шоу, падвяргаецца знявазе, хамскім нападкам. Такі "піар" патрэбны, каб праз прыніжэнне асобы зняважыць краіну, прадстаўніком якой з'яўляецца апанент, праз варожасць да яе выклікаць агіду да палітыкі праўладу.

На жаль, беларускае грамадства жыве ў чужой інфармацыйнай прасторы. Акрамя прадукцыі, сутнасць адна. Аднабаковая канцэпцыя падрыхтоўкі відавочная, прыёмы і метады работы стваральнікаў шоу, адны і тыя ж удзельнікі перадач амаль пераскокваюць з канала на канал. Гэтыя расійскія каналы ўваходзяць у танны сацыяльны пакет на тэрыторыі Беларусі, што дае ім шырокую аўдыторыю, то бок масавага гледача. Праўда, чалавек можа не глядзець праграму, якая напоўнена разбуральнай энергетыкай, і пераключыць тэлевізар. Але хто ведае, які працэнт грамадзян нашай краіны не выключаюць тэлевізар і глядзяць гэтыя праграмы і з-за замбіравання падзяляюць пазіцыю іх аўтараў, а гэта значыць, фактычна з'яўляюцца прыхільнікамі чужой ідэалогіі?

Магчыма, прыйшоў час ідэалагічнага пастара суседняй дзяржавы ў Мінск для непасрэднай сустрэчы са сваёй загадзя падрыхтаванай тэлевізійнай хлуснёй і ёсць праверка гатоўнасці часткі беларускага грамадства пайсці ў адной плыні з "імперскім расійскім гіпертэкстам" (тэрмін узяты з развагаў Салаўёва і К° аб рускай нацыянальнай ідэі падчас перадачы 6 лістапада).

Нашаму грамадству, нарэшце, неабходна асэнсаваць тую вялікую небяспеку, якая пад маркай палітычных дыскусій сыходзіць кожны дзень з блакітнага экрана, а зараз і з розных сталічных залаў, гаспадарамі якіх адчуваюць сябе маскоўскія эмісары. Яны прыязджаюць да нас не з добрай воляй, а каб яшчэ больш паўплываць на свядомасць беларусаў, каб убіць у нашы галовы свае імперскія памкненні аб Маскве як трэцім Рыме.

Менавіта скажэнне рэчаіснасці – шлях да ўзброеных канфліктаў між дзяржавамі. Вайна, што вядзецца з 2014 года на Украіне, была б немагчыма без інфармацыйных і прапагандысцкіх чыннікаў. Салаўёў у Мінску – адкрыты выклік дэмакратычнай супольнасці Беларусі, як і суседняй братняй Украіне і яе народу.

Узгадаем словы міністра абароны Польшчы А.Мацэровіча: "Інфармацыйная вайна здольная зрабіць дзяржаву бездапаможнай, зрабіць так, што яна нават без вайны стане здабычай для суседзяў".

У такім выпадку ці не даць нам пад адно месца ўсялякім салаўёвым, якія едуць у Мінск з адной мэтай – падарваць устоі нашай дзяржавы, нашага талерантнага грамадства?

Ада ЧАЛЕЙ, сябра Сойму руху салідарнасці "Разам".

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Калі жонка ў блудзе, грошай болей будзе

У Магілёве пры дапамозе інтэрнэта дзяцюк запатрабаваў у палюбоўніка сваёй жонкі 1000 долараў, інакш, маўляў, паведамлю пра інтымную сувязь мужу жанчыны. Гэта значыць, самому сабе. Цікава, што палюбоўнік заплаціў.

По-рознаму ўспрымаюць
здраду
Сваёй абранніцы мужы…
Адзін распачынае зваду,
Якая з бойкай на мяжы;
Другі, адчуўшы, што "рагаты",
Што ён звычайны аблавух,
"Палову" ў якасці адплаты
Ці паганяе каля хаты,
Ці ўлепіць пару аплявух;
Палена ў рукі возьме трэці,
Не страшны нават суд яму:
Ён жонку будзе біць да смерці,
Затым адправіцца ў турму.
Чацвёрты сам палезе ў пельку,
Дазнаўшыся пра жончын блуд,
Або "падсядзе на бутэльку"
І месяц піцьме ад пакут.
Усё звычайна і тыпова,
Хоць варыянтаў ледзь не сто.
А вось дзяцюк, што з Магілёва,
Арыгінальны як ніхто.
Аднойчы ён адчуў таксама,
Што "рогі выраслі" на лбе.
Ды гэта, палічыў, не драма,
Карысць убачыў для сябе
У жончыным бязбожным
блудзе:
"Калі гульне на старане,
Дык, мовіць так, з яе не ўбудзе,
Прытуліцца і да мяне.
"Таптаць" жа жонку на халяву
Больш палюбоўніку не дам.
Калі ён хоча мець забаву,
Абмацваць цела тут і там,
Дык хай адшчыквае даляры,
Я ўсё-такі законны муж…"
І раганосца грэлі мары,
Што атрымае ладны куш.
Прынамсі, можа быць,
хоць трошку
Сямейны вырасце бюджэт.
Свайму "намесніку па ложку"
Паведаміў праз інтэрнэт:
"Нядаўна я дазнаўся, дружа,
Што "топчаш" ты адну з кабет.
Для ейнага расцяпы-мужа
Пакуль што гэта ўсё сакрэт.
Калі ты мне заплаціш грошы,
Я мужу не шапну пра ваш
Занятак вельмі нехарошы…"
І палюбоўнік на шантаж
Паддаўся! Каб з яго каханай,
Крый Божа, не было бяды,
Каб доля не была паганай,
Даў мужу грошы сапраўды.
Муж небараку, зразумела,
Не раз "даіў" з тае пары,
Прымаў за жончынае цела
Ад палюбоўніка дары,
Ды ўсё адно, ён лічыць, мала –
Ракой прыбытак не цячэ.
Няхай бы жонка напаткала
І цешыла кагось яшчэ.
Стаў браць дзяцюк
камандзіроўкі
(Хоць гэта дужа неўспадоб),
Каб жонку зноўку
хтосьці лоўкі
У ложак да сябе загроб.
Як толькі палюбоўнік новы
Ягоны праглыне кручок,
Дык раганосец зноў гатовы
Разжыцца трохі за маўчок…

* * *

Ідэю дзецюку падкіну,
Як лепш "узбіцца на рубель":
Яму наогул "палавіну"
Пасылаць патрэбна на панэль.

З ПІСЬМА…

Трэба карэнным чынам мяняць сістэму аплаты працы кіраўнікоў



Надзвычай востра стаіць пытанне кадраў. На мой погляд, трэба карэнным чынам мяняць сістэму аплаты працы кіраўнікоў. Ці ж гэта нармальна, калі шараговыя работнікі маюць мізэрны заробак, а начальнік – у пяцьдзесяць разоў большы? Плюс службовая машына, плюс памочнік, сакратарка…

Зарплата кіраўніка павінна ўвязвацца з сярэднім заробкам па прадпрыемстве. Калі, напрыклад, рабочыя зарабляюць у месяц пяць тысяч рублёў, то дырэктару дастаткова плаціць тысяч сем-восем. Не болей. Няхай днём і ноччу думае, як падняць узровень вытворчасці на прадпрыемстве, палепшыць эканамічныя паказчыкі, з тым каб фінансавае становішча дазволіла павысіць заробкі рабочых, а заадно – і сваю зарплату.

Расціслаў ВАШКЕВІЧ, дырэктар УП "РАСІД-97".
Мінск.

Як я змагаўся за беларускую мову ў магазіне рытуальных паслуг

Нядаўна мяне напаткала вялікае гора. І я вымушаны быў звярнуцца ў магазін рытуальных паслуг, каб набыць адпаведны атрыбут для ўшанавання памяці стрыечнай сястры. Балазе магазін амаль побач з домам, у якім я пражываю, – на вуліцы Несцерава.

Падаю тэкст для напісання на жалобнай стужцы. І тут жа чую:

– На белорусском мы не пишем, только на русском.

Звяртаю ўвагу, што такім чынам парушаецца закон аб мовах. У адказ спасылка на Лукашэнку: маўляў, ён жа гаворыць па-руску.

У самоце і з абурэннем пакідаю ўстанову, якая дзейнічае пад шыльдай "Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Адэль-фос". Успомніў, што на вуліцы Аранскай таксама ёсць магазін рытуальных паслуг.

– Ды мы вам напішам на любой мове, – сказаў мне адзін з прадаўцоў. Пры гэтым пацікавіўся, якога полу і якога ўзросту нябожчык. Пакуль словы выводзіліся на стужцы, ён прапанаваў адпаведны кошык з кветкамі, праз некалькі хвілін замацаваў стужку так, каб не баўталася, ды ўпакаваў усё ў вялікі цэлафанавы пакет.

Я не стаў бы пісаць пра ўсё гэта, калі б не далейшы працяг гісторыі пасля таго, як я ў першым магазіне вырашыў зрабіць запіс у Кнізе заўваг і прапаноў. Неўзабаве атрымаў афіцыйны адказ. Вось ён:

«На Вашу запись в Книге замечаний и предложений от 12 октября 2016 года сообщаю следующее. На сегодняшний день отсутствует техническая возможность надписи ленты принтером на белорусском языке по причине отсутствия на клавиатуре компьютера белорусской азбуки. Вам было предложено осуществить надпись на ленте специальным маркером, однако Вы от данного предложения отказались.

Директор ООО «Адэль-фос» П.А.Поляков».

Я не апісваю, з якой цяжкасцю я дабіўся, каб усё ж атрымаць Кнігу заўваг і прапаноў. На маё законнае патрабаванне мяне сталі палохаць міліцыяй і імітаваць, быццам яны яе ўжо выклікаюць. Хутка прыехаў дырэктар, але ён нават не прадставіўся. Дарэчы, нельга было даведацца і прозвішчы прадаўцоў.

Ліст ад спадара Палякова я вярнуў з допісам: маўляў, прашу даць адказ на мове, на якой зроблены запіс, а атрыманы адказ лічу знявагай і адпіскай.

А цяпер даю вытрымкі з дыктафоннага запісу, які я зрабіў падчас гутаркі з работнікамі магазіна рытуальных паслуг, што на вуліцы Несцерава. Лічу, што гэта была адкрытая спроба абвінаваціць мяне ў русафобіі.

– Такая позиция у вас и у военных Украины: кто не скачет, тот москаль… (Не зразумела, з якой нагоды гэта сказана і дзеля чаго?)…

– Как вам не стыдно так относиться к русскому языку? У нас президент говорит по-русски… (Я ні слова не сказаў пра рускую мову.)

– Я и директор не белорусы… (А я ў іх і не пытаўся, хто яны па нацыянальнасці.)

– Почему у вас такое пренебрежение к русскому языку?.. (?!)

Вось да чаго дажыліся! Я, беларус, не магу папрасіць прыгожа напісаць на беларускай мове некалькі слоў. Не ад рукі, не абы як, а выкарыстоўваючы камп'ютарныя тэхналогіі. Замест таго каб выконваць закон, спасылаюцца на прэзідэнта, маўляў, ён размаўляе па-руску.

Шмат нерваў я згубіў, але ўсё ж дасягнуў жаданага. Неўзабаве на прылаўку згаданага магазіна з'явілася невялічкая аб'ява, што надпісы на беларускай мове робяцца спецыяльным маркерам. А што, нельга было вырашыць такую праблему раней?

Мікола ЛАВІЦКІ, пенсіянер.
Мінск.

ЭКСТРЫМ


Фота TUT.BY

Праз агонь і ваду…

У мінулыя выхадныя ў гарналыжным комплексе "Сілічы" пад Мінскам прайшлі незвычайныя спаборніцтвы.

Экстрэмальны бег з перашкодамі – для аматараў актыўнага адпачынку. Напрыклад, для тых, хто вырашыў выступаць індывідуальна, арганізатары падрыхтавалі трасу працягласцю 8 кіламетраў, на працягу якой трэба было пераадолець 30 бар'ераў: агонь і ваду, канавы і павуціннe з вяровак. На шляху да фінішу ўдзельнікаў таксама чакала перацягванне каната, перанос бярвенняў, перамяшчэнне вялізных колаў і нават сустрэча з гладыятарамі.

Але нічога – незадаволеных не было. І для многіх галоўным і на самай справе была не перамога…

ВАС ЦІКАВІЦЬ…

Каб стаць членам «Ліберальнага клуба»…

Апошнім часам даволі часта сустракаю ў газетах і па тэлебачанні спасылкі на экспертаў "Ліберальнага клуба". Падкажыце, а што гэта за арганізацыя, калі і кім створана, хто ёй кіруе? І ці можна да яе далучыцца?

Валерый ЖАЛЕЗНЫ, Мінскі раён.



«Дыскусійна-аналітычная супольнасць «Ліберальны клуб» – гэта непалітычная некамерцыйная арганізацыя, якая займаецца рэалізацыяй даследчых і адукацыйных праектаў. «Ліберальны клуб» стварылі ў 2007 годзе як нефармальную дыскусійную пляцоўку для маладых інтэлектуалаў. А 7 снежня 2009 года клуб быў афіцыйна зарэгістраваны як грамадскае аб'яднанне.

«Ліберальны клуб» не адлюстроўвае думкі і пазіцыі дзяржаўных інстытутаў, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў або асобных грамадзян.

"Мы імкнёмся аб'ектыўна вывучаць і асвятляць сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя і культурныя працэсы ў Беларусі, – распавёў "Народнай Волі" адміністрацыйны дырэктар "Ліберальнага клуба" **Мікіта Бяляеў**. – *Наша дзейнасць грунтуецца на каштоўнасцях адкрытага грамадства: індывідуальныя і калектыўныя свабоды грамадзян, дэмакратыя, рынкавая эканоміка, вяршэнства права, свабодная канкурэнцыя ідэй і ініцыятыў.*

Мы супрацоўнічаем з рознымі грамадскімі арганізацыямі, фондамі, навукова-даследчымі цэнтрамі і інстытутамі, сродкамі масавай інфармацыі. Асновай супрацоўніцтва з'яўляецца агульнае імкненне да выпрацоўкі аптымальных для Беларусі палітычных і эканамічных рашэнняў, здольных істотна павысіць канкурэнтаздольнасць эканомікі, дабрабыт грамадзян, нацыянальную бяспеку, а таксама ўзровень даверу паміж уладамі і насельніцтвам.

«Ліберальны клуб» выступае за цывілізаваны дыялог паміж усімі пластамі беларускага грамадства".

Сябрам «Ліберальнага клуба» можа стаць любы чалавек, які падзяляе каштоўнасці і мэты арганізацыі і гатовы браць актыўны ўдзел у яе працы. Заяўкі ад кандыдатаў на ўступленне разглядае савет клуба.

"Для таго каб стаць сябрам Ліберальнага клуба, трэба наведваць нашы мерапрыемствы, цікавіцца даследчай тэматыкай, вольнай эканомікай і прайсці сумоўе з цяперашнімі членамі клуба, – распавядае Бяляеў. – *Калі вы хочаце ўдзельнічаць у нашых мерапрыемствах, дапамагаць нам, то гэта можна рабіць і без членскіх узносаў».*

Дарэчы, сёння ў "Ліберальным клубе" ўсяго 12 членаў.

На якія сродкі існуе арганізацыя?

"У тым ліку і на ўнёскі, – адказвае Мікіта Бяляеў. – *Мы грамадская арганізацыя, многія нашы члены маюць пастаяннае месца працы, хтосьці вучыцца, выкладае..."*

Стваральнікамі арганізацыі лічацца **Мікіта Бяляеў** і **Яўген Прэйгерман.**

Мікіце Бяляеву 27 гадоў, ён аспірант БДУ. Год таму Мікіта абараніў магістарскую дысертацыю ў БДУ па тэме "Беларускі шлях: эвалюцыя сістэмы дзяржаўнага кіравання". Валодае англійскай мовай. Захапляецца сноўбордынгам і веласпортам.

Яўгену Прэйгерману 30 гадоў. Ён з адзнакай закончыў факультэт міжнародных адносін БДУ. Вучыўся ў Вышэйшай народнай школе Карлскруну (Швецыя), у магістратуры па праграме «Еўрапейская палітыка» University of Sussex (Вялікабрытанія). Мае дыплом з адзнакай і спецыяльную ўзнагароду як лепшы магістр года. Валодае англійскай і шведскай мовамі. Захапляецца футболам, кухнямі народаў свету.

Марына КОКТЫШ.

ЗАЯВЛЕНИЕ

На четвертый срок

Ангела Меркель на пресс-конференции в Берлине заявила, что вновь будет бороться за пост канцлера ФРГ. Будущие выборы в бундестаг она назвала «самыми сложными с момента воссоединения Германии».



ДОСЬЕ

Имя: Ангела Меркель.
Дата рождения: 17 июля 1954 г. (62 года).
Знак Зодиака: Рак.
Восточный гороскоп: Лошадь.
Место рождения: г.Гамбург.
Деятельность: политик, канцлер Германии.
Рост: 165 сантиметров.
Вес: 75 килограммов.

Ангела Меркель (в девичестве Каснер) – первая женщина-канцлер в истории Германии, занимающая этот пост с 2005 года. Имеет польские корни и возглавляет партию ХДС.

Ангела Меркель родилась в Гамбурге 17 июля 1954 года в семье священника Хорста Каснера, настоящая фамилия которого была при рождении Казмерчак. Через несколько дней после рождения Ангелы ее семья переехала в ГДР. Детство Ангелы прошло в городе Темплин на северо-востоке Германии. В школе юная Ангела отличалась успехами в математике и (внимание!) в русском языке.

Ангела Меркель имеет диплом физика Лейпцигского университета им.Маркса.

В студенческие годы начала интересоваться политикой и придерживалась оппозиционных взглядов. После университета работала в Берлине, в Академии наук ГДР, в отделе теоретической химии.

В 1982 году Ангела Меркель развелась с первым мужем, а уже спустя два года познакомилась со своим нынешним мужем, химиком Иоахимом Зауэром. Детей у нее ни в одном браке не было.

Политическая биография Меркель началась еще до объединения Германии. Партия «Демократический прорыв», куда Ангела устроилась работать в 1989 году, отличалась непостоянством политического курса и была замешана в разного рода скандалах. В 1990 году партия вошла в состав ХДС, и Ангела получила хороший старт для рывка к вершине.

В 1990-х годах Меркель уже была федеральным министром сначала по делам женщин и молодежи, а затем по охране окружающей среды. После поражения христианского блока на выборах 1998 года Меркель стала одним из преемников «вечного канцлера» Коля. В 2000 году Ангела возглавила партию. За 5 лет пребывания в оппозиции Меркель укрепила свой авторитет не только как лидер ХДС, но и как кандидат на пост канцлера.

На выборах 2005 года блок ХДС/ХСС вернул себе большинство в Бундестаге, и Меркель стала первой в истории Германии женщиной-канцлером, при этом побив и возрастной рекорд: на момент вступления в должность ей был всего 51 год.

На посту канцлера Меркель проявляет себя классическим технократом, не проводя значительных реформ, но и не вгоняя Германию в застой. Основной проблемой Германии был и остается приток мигрантов, исповедующих ислам. Выборы 2013 года прошли для Меркель довольно гладко, и ей удалось сохранить за собой пост канцлера.


Первая клятва на посту канцлера.

СЛЫШАЛИ?



Саркози уходит из политики

Бывший президент Франции Николя Саркози, считавшийся одним из фаворитов, вопреки ожиданиям своих сторонников не прошел во второй тур праймериз правоцентристов во Франции. И заявил об уходе из политики.

Согласно предварительным итогам голосования, Саркози получил 22,9% голосов, уступив своим соперникам – бывшим премьер-министрам Франсуа Фийону и Алену Жюппе, которые набирают соответственно 43,6% и 26,7% .

Николя Саркози признал поражение и выразил свою поддержку Франсуа Фийону.

ТАМ, ЗА ОКЕАНОМ

В США обнаружено крупнейшее в истории страны месторождение нефти

Геологическая служба США сообщила об обнаружении в штате Техас крупнейшего из всех известных ей месторождений нефти в стране. На сайте государственной службы появилась информация о содержащихся в сланцевом бассейне Wolfcamp порядка 20 миллиардов баррелей нефти, 450 миллионов кубометров природного газа и 1,6 миллиарда баррелей сжиженного природного газа. Эти объемы примерно втрое превышают запасы обнаруженного в 2013 году месторождения Bakken-Three Forks в Баккеновской формации на территории нефтегазоносного бассейна Уиллистон.

СКАНДАЛ

За импичмент президента Пак Кын Хе

Оппозиция Южной Кореи начала сбор подписей за импичмент президента Пак Кын Хе, которую обвиняют в причастности к коррупционному скандалу.

«Президент Пак должна уйти как можно скорее», – заявила журналистам глава оппозиционной Демократической партии Чху Ми Э.

Скандал вокруг президента Пак Кын Хе разгорелся после того, как журналисты одного из кабельных каналов нашли в мусорном баке отеля планшет с секретными документами, среди которых были тексты речей президента. Позже президент призналась, что в первые годы на посту советовалась со своей подругой Чхве Сун Силь при подготовке к выступлениям, и принесла извинения гражданам страны.

ПО ВАШЕЙ ПРОСЬБЕ

До сих пор многие люди оправдывают большевизм. Мол, Ленин и его соратники хотели построить справедливое общество, чтобы не было богатых, но и не было бедных. А потому и уничтожался так называемый класс кулаков.

В школе нам когда-то говорили, что именно эта цель преследовалась при подавлении известного Тамбовского восстания. В подробности, правда, никто из учителей не вникал, но, помню, протест крестьян назывался кулацко-эсеровским мятежом.

Может быть, «Народная Воля» просветит меня и всех читателей по этому вопросу…

Степан ДУБРОВЧЕНКО.
Гомель.

Тамбовское восстание

Помочь автору письма не так уж и сложно. На сегодняшний день имеется немало литературы (не только советских времен, но и последних), посвященной этому историческому событию. Поскольку с ранее излагавшейся точкой зрения люди старшего поколения хорошо знакомы, то изложим взгляд ученых, которые не исповедуют большевистские догмы.

Итак, восстание крестьян в Тамбовской губернии происходило в 1920–1921 годах. Протест был вызван тем, что с установлением большевистской власти местное население лишилось всяких политических и экономических прав. Тем, кто работал на земле, запретили торговать хлебом и стали забирать его силой. В 1920 году край поразила сильная засуха, и зерна было собрано всего 12 миллионов пудов, а в ходе продразверстки планировалось забрать у селян 11,5 миллиона пудов.

Население Тамбовщины ответило активным вооруженным сопротивлением. В 1918 году в восстаниях и партизанском движении против большевиков, продотрядов и комбедов приняло участие до 40 тыс. человек. На их сторону нередко переходили красноармейцы, зачастую с оружием в руках. В июне 1920 года на совещании командиров партизанских групп и отрядов местной самообороны было решено для лучшей координации действий объединить все силы в 1-ю и 2-ю повстанческие армии.

15 августа 1920 года в селе Хитрово Тамбовского уезда вспыхнуло восстание. Местный комитет созданного эсерами Союза трудового крестьянства разоружил продотряд. Затем сразу в нескольких селах крестьяне отказались сдавать хлеб и при поддержке партизан уничтожили продотряды, местных коммунистов и чекистов.

14 ноября 1920 года повстанцы решили объединить все свои силы под единым командованием. Они создали Объединенную партизанскую армию Тамбовского края под командованием Георгиевского кавалера поручика Петра Токмакова, происходившего из местных крестьян. Под его началом стояло от 20 тысяч до 50 тысяч человек. Политическая программа строилась на демократической основе под лозунгами свержения большевистской диктатуры, созыва Учредительного собрания, восстановления политических и экономических свобод.

В советской историографии Тамбовское восстание называли «антоновщиной» по фамилии начальника штаба 2-й повстанческой армии эсера А.С.Антонова. Однако этот термин появился только к началу процесса над эсерами в 1921 году. Коммунисты хотели изобразить протест крестьян как эсеровский мятеж под руководством братьев Антоновых.

ЦК РКП(б), СНК и лично В.И.Ленин приняли решительные меры для локализации и быстрейшей ликвидации восстания, недопущения взаимодействия его руководителей с такими же недовольными Советской властью крестьянами на Дону, в Воронежской и Саратовской губерниях.

В Тамбов срочно выехала полномочная комиссия ВЦИК под председательством В.А.Антонова-Овсеенко. Была резко увеличена численность войск, направленных на подавление протеста народных масс.

Боевыми действиями против отрядов повстанцев руководили М.Н.Тухаческий, И.П.Уборевич, Г.И.Котовский, Н.Е.Какурин, И.Ф.Федько, И.В.Тюленев и другие. К весне 1921 года ряды мятежников изрядно поредели, и через год с лишним восстание было окончательно подавлено, а А.С.Антонов, один из его главных руководителей, бежал и в июне 1922 года был убит в перестрелке («Советская военная энциклопедия», т.1, 1976).

Следует сказать, что в числе других известных палачей крестьян были «военный гений» Г.К.Жуков (получил орден: убивал много). Усмирителем восставших крестьян был А.П.Гайдар (Голиков), который затем прославился как детский писатель. Легендарный Г.И.Котовский при подавлении Тамбовского восстания проявил себя с наилучшей по большевистским понятиям стороны. Например, выходя из штаба, мог убить двух-трех проходящих мимо и ничего не подозревающих человек. И.П.Уборевич в процессе подавления восстания крестьян любил разъезжать на броневике. Зачастую по приказу Уборевича из деревень в поле выводили местных жителей, которых он расстреливал двумя пулеметами со своего броневика.

Есть в исследованиях независимых ученых и такие строки: «Летом 1920 года продотряды, в точности как в 1918-м, отбирали у крестьян не только «излишки» хлеба, но и «продпорму», обрекая их на голод. Непокорных избивали, отбирали последнюю корову, а то и домашнее имущество. Отряды по борьбе с дезертирством угоняли единственных кормильцев многодетных семей. 19 августа 1920 года крестьяне разоружили красный продотряд и разогнали Совет в селе Каменка. Так началось Тамбовское восстание. К октябрю восстание охватило пять уездов, где были упразднены органы Советской власти, перекинулось в Воронежскую губернию, перерезало важные железнодорожные линии и охватило территорию, на которой проживало 3,3 миллиона населения…»

20 мая 1920 года в селе Карай-Салтыки Кирсановского уезда Тамбовской губернии было провозглашено создание нового государства: Республики Тамбовского партизанского края со всеми правами до проведения Учредительного собрания. Глава – местный крестьянин Шендякин… Официальными лозунгами были «Долой уголовно-бандитскую власть предателей русского народа – коммунистов!», «Да здравствует Великая, Единая и Неделимая Россия!», «Да здравствует Учредительное собрание!».

К лету 1921 года интернациональные части Красной Армии насчитывали, по разным оценкам, от 182 тысяч до 250 тысяч человек. В Тамбовщину вошли китайские и венгерские части. Прибыло 9 кавалерийских дивизий и бригад, 6 бронепоездов, 5 отрядов с крупнокалиберными пулеметами. Два авиаотряда насчитывали более 40 самолетов. Во главе войск поставили Тухачевского, разбитого на Висле. «Они не щадят себя в бою, а также своих жен и детей, бросаясь на пулеметы, как волки», – докладывал Тухачевский в ЦК. Именно тогда появилась поговорка «тамбовский волк».

12 июня Тухачевский подписал приказ об использовании газов. На Тамбовщину «народная» Советская власть отправила химический полк, пять химкоманд, химические снаряды, 250 баков с боевым хлором. Много позже в своих сочинениях Тухачевский напишет: *«Борьбу приходится вести в основном не с бандами, а со всем местным населением…»* Тухачевский приказал сжигать дотла мятежные деревни, подвергать конфискации имущество и угонять скот. Повстанцы ушли из деревень, базировались в лесах. Они не хотели подвергать риску свои семьи. Тогда ВЦИК издал постановление №130, согласно которому создавались концентрационные лагеря – для членов семей повстанцев. Общее число концлагерей неизвестно. Есть конкретные сведения о двенадцати. Два концлагеря находились непосредственно в Тамбове. Все известные концлагеря были просто участками луга, огражденными колючей проволокой. Если и кормили, то сырой картошкой и сырыми овощами.

(Окончание на 6-й стр.)

МИЛОСЕРДИЕ

Папа Римский подвел итоги Юбилейного года римско-католической церкви



Закрыв Святые врата собора Святого Петра, Папа Римский завершил внеочередной Юбилейный год, посвященный божественному милосердию. Он призвал «никогда не закрывать двери примирения и прощения».

Впервые Святой, или Юбилейный, год римско-католической церкви был отмечен в 1300 году, ныне он объявляется каждые 25 лет – предыдущий регулярный Юбилейный год прошел в 2000 году. Однако Папа Римский может объявить внеочередной Юбилейный год, что и сделал Франциск в 2015 году, посвятив его божественному милосердию. Паломникам необходимо было пройти через так называемые Святые врата, установленные рядом с основными воротами в одной из четырех Великих базилик в Риме. Они символизируют прощение и божью милость. Открывает и закрывает Святые врата в начале и конце года сам Папа Римский.

ХОРОШИЙ ПРИМЕР

Превратил свой подъезд в музей





Киевский пенсионер Владимир Чайка превратил самый обыкновенный подъезд своего дома в музей – украсил стены лепниной и развесил картины.

По его словам, он всегда мечтал жить в окружении красивых вещей и, выйдя не пенсию, осуществил свою мечту.

В изображении уличного художника



Одну из стен в центре Вильнюса украшает огромное изображение Владимира Путина и Дональда Трампа. В первоначальной версии граффити они были изображены целующимися, а затем – курящими марихуану.

Литовские власти выражают свое видение ситуации не столь провокационным образом, однако в целом разделяют мнение уличного художника о том, что Путин и Трамп слишком близки, что вызывает некий дискомфорт.

Здесь опасаются, что с приходом Трампа США будут заинтересованы в России как в потенциальном партнере и вряд ли охотно согласятся с мнением восточноевропейских стран о том, что Россия представляет для них непосредственную и очень серьезную угрозу.

ПО ВАШЕЙ ПРОСЬБЕ

Тамбовское восстание

(Окончание. Начало на 5-й стр.)

Детей, которые могли ходить, сразу отделяли от матерей и гнали в другие лагеря. Уборных не было. Охрана – в основном нерусские.

Согласно приказу №130, если партизан не выходил из лесу и не сдавался через две недели после заключения семьи в концлагерь, его семью отправляли в Северные лагеря ("на переработку"). Фактически в этом не было необходимости, умирали и здесь.

В газетах печатались снимки расстрелянных, необходимость и полезность красного террора обсуждалась в прессе, так же печаталось про восстание. Газеты выходили с заголовками: "Губерния объявлена на положении Кронштадта!", "Мы уничтожили семьи бандитов – они должны отвечать за них!", "Травить их удушливым и отравляющим газом!". У одного только села Пахотный Угол газами было убито 7000 крестьян, в том числе женщин и детей, прятавшихся в лесу…

Читаем: «К концу мая (1921 г.) в Тамбове, Борисоглебске, Кирсанове и других городах губернии спешно поставили концлагеря на 15 тысяч человек и попробовали по каждому селу составить список «бандитов». 28 мая войска перешли в решающее наступление на повстанцев… Тухачевский сурово проводил тактику «выжженной земли» на 20 лет раньше Моделя (немецкий генерал-фельдмаршал (1944), проводил тактику «выжженной земли» так, чтобы не пострадало мирное население), в Тамбовской губернии, где не только жгли крестьянские избы, но и безжалостно расстреливали их обитателей, а убежавших травили ядовитыми газами» (Б.В.Соколов «Михаил Тухачевский: жизнь и смерть «Красного маршала». 1999. С.48; 210).

В день прибытия в Тамбов 12 мая 1921 года Тухачевский издал приказ №130 под названием «Приказ участникам бандитских шаек». В приказе сказано:

«1.Рабоче-крестьянская власть решила в кратчайший срок покончить с разбоем и грабежом в Тамбовской губернии и восстановить в ней мир и честный труд.

2.Рабоче-крестьянская власть располагает в Тамбовской губернии достаточными военными силами. Все, поднимающие оружие против Советской власти, будут истреблены.

Вам, участникам бандитских шаек, остается одно из двух: либо погибать, как бешеным псам, либо сдаваться на милость Советской власти…

5.Немедленно прекратить сопротивление Красной Армии, разбой и грабеж, явиться в ближайший штаб Красной Армии, сдать оружие и выдать своих главарей.

К тем, кто сдаст оружие, приведет главарей и вообще окажет содействие Красной Армии в изловлении бандитов, будет широко применено условное осуждение и в особых случаях – полное прощение.

6.Согласно приказу красного командования за №130 и «Правилам о взятии заложников», опубликованным Полномочной комиссией 12 сего мая, семья уклонившегося от явки забирается в качестве заложников и на имущество накладывается арест.

Семья содержится две недели в концентрационном лагере. Если бандит явится в штаб Красной Армии и сдаст оружие, семья и имущество освобождаются от ареста. В случае же неявки бандита в течение двух недель семья высылается на Север на принудительные работы, а имущество раздается крестьянам, пострадавшим от бандитов.

7.Все, кто оказывает то или иное содействие бандитам, подлежат суровой личной и имущественной ответственности перед судом ревволентрибунала как соучастники измены трудовому народу. Только немедленным раскаянием, выдачей главарей и оружия они могут заслужить прощение.

Участники бандитских шаек!

Полномочная комиссия вам заявляет:

Ваши имена известны Чека. Будете взяты либо вы, либо ваша семья и имущество. Сдавайтесь!».

Из приказа полномочной комиссии ВЦИК №171 от 11 июня 1921 года: «Банда Антонова решительными действиями наших войск разбита, рассеяна и вылавливается поодиночке. Дабы окончательно искоренить все эсеро-бандитские корни и в дополнение к ранее отданным распоряжениям, полномочная комиссия ВЦИК приказывает:

1.Граждан, отказывающихся называть свое имя, расстреливать на месте без суда.

2.Объявлять приговор об изъятии заложников и расстреливать таковых в случае несдачи оружия.

3.В случае нахождения спрятанного оружия расстреливать на месте без суда старшего работника в семье.

4.Семья, в которой укрылся бандит, подлежит аресту и высылке из губернии, имущество конфискуется, а старший работник в семье расстреливается без суда.

5.Семьи, укрывающие членов семей или имущество бандитов, – старшего работника таких семей расстреливать на месте без суда.

6.В случае бегства семьи бандита имущество его распределить между верными Советской власти крестьянами, а оставленные дома сжигать или разбирать.

7.Настоящий приказ проводить в жизнь сурово и беспощадно.

Председатель полномочий ВЦИК В.А.Антонов-Овсеенко.

Командующий войсками М.Н.Тухачевский.

Председатель губисполкома А.С.Лавров.

Секретарь губкома партии Б.А.Васильев.

Приказ зачитать на сельских сходах».

23 июня 1921 года в приказе №116 Антонов-Овсеенко и Тухачевский обобщили опыт наиболее результативных чисток и, усовершенствовав методы, предложили оптимальный способ проведения операции: «Намечаются особенно бандитски настроенные волости, и туда выезжают представители уездной политической комиссии, особого отделения, отделения военного трибунала и командования вместе с частями, предназначенными для проведения чистки. По прибытии на место волость оцепляется, берутся 60–100 наиболее видных лиц в качестве заложников и вводится осадное положение. Выезд и въезд в волость должны быть на время операции запрещены. После этого собирается полный волостной сход, на коем прочитываются приказы Полномочной Комиссии ВЦИК №130 и 171 и написанный приговор для той волости… Жителям дается 2 часа на выдачу бандитов и оружия, а также бандитских семей, и население ставится в известность, что в случае отказа дать упомянутые сведения заложники будут расстреляны через два часа. Если население бандитов и оружия не указало по истечении двухчасового срока, сход собирается вторично и взятые заложники на глазах у населения расстреливаются, после чего берутся новые заложники и собравшимся на сход вторично предлагается выдать бандитов и оружие. Желающие исполнить это становятся отдельно, разбираются на сотни, и каждая сотня пропускается для опроса через опросную комиссию (представителей Особого отдела и Военного трибунала). Каждый должен дать показания, не отговариваясь незнанием. В случае упорства проводятся новые расстрелы и т.д. По разработке материала, добытого из опросов, создаются экспедиционные отряды с обязательным участием в них лиц, давших сведения, и других местных жителей и отправляются на ловлю бандитов. По окончании чистки осадное положение снимается, водворяется ревком и насаждается милиция.

Настоящее Полномочная Комиссия ВЦИК приказывает принять к неуклонному исполнению» (Б.В.Соколов «Михаил Тухачевский: жизнь и смерть «Красного маршала». 1999. С.117–218).

К сентябрю 1921 года погибли почти все командиры восставших крестьян: убит в бою Токмаков, при переправе через Хопер ранен и утонул Богуславский. Под Шендяпиным убили коня. Не желая попасть в плен, он застрелился.

К октябрю 1921 года восстание было почти подавлено… Всю 50–70-тысячную Единую армию можно смело считать покойниками. Число истребленных крестьян – порядка 100–150 тысяч человек. Потери Красной Армии – не мене 10 тысяч. Саму Тамбовскую губернию упразднили как административную единицу и снова создали как Тамбовскую область в 1937 году: в три раза меньше прежней» (М.Веллер, А.Буровский «Гражданская история безумной войны». 2007. С.481–488).

В 1994 году по инициативе президента России Б.Н.Ельцина восставшие крестьяне Тамбовщины были реабилитированы. (В хрущевскую оттепель был реабилитирован кровавый палач тамбовских крестьян И.П.Уборевич.)

Такова история Тамбовского восстания.

ЗЕМЛЯКИ

В Новогрудке сват Дональда Трампа отключает свой мобильный телефон

Сват Дональда Трампа американский миллиардер Чарльз Кушнер пообещал передать своему сыну Джареду Кушнеру и его жене приглашение приехать в Новогрудок.



Приглашение ему по электронной почте сразу же после избрания Дональда Трампа 45-м президентом США отправила краевед, создатель Музея еврейского сопротивления в Новогрудке Тамара Вершицкая.

– Сам Чарльз не раз бывал в Новогрудке вместе с женой, привозил сюда своих внуков, – рассказала grodnonews.by Тамара Вершицкая. *– В первые визиты я встречала их в Минске, теперь они хорошо ориентируются и сами добираются до Новогрудка. Обычно Чарльз Кушнер проводит у нас один день, непременно посещает Музей еврейского сопротивления, партизанскую стоянку у деревни Черешля, Кореличи. Он показывает внукам улицу в Кореличах, где когда-то стоял дом его отца. Дом не сохранился, но рядом есть похожие строения.*

Впервые Чарльз Кушнер побывал в Беларуси в 1989 году, еще до распада СССР, и привез свою мать Раю. С тех пор в разных поездках его сопровождали племянница, сын Джошуа и всегда – жена. Нынешним летом он приехал еще и с внуками. Мальчикам-двойняшкам тогда исполнилось 13 лет. По еврейским канонам это возраст зрелости. Ребята должны пройти через обряд Бар-мицва – посвящения во взрослую жизнь.

– Чарльз Кушнер пообещал, что привезет в Новогрудок всех своих внуков, когда им исполнится 13 лет, – отметила Тамара Григорьевна. *– Это серьезный возраст в жизни мальчика, который становится юношей. И дедушка уверен, что, вступая во взрослую жизнь, они должны соприкоснуться со своими корнями. Для него очень важно показать внукам, где и в каких условиях жили их прадедушки и прабабушки. В Новогрудке Чарльз Кушнер отключает свой мобильный телефон и водит внуков по местам своих предков. Очередное 13-летие в семье ожидается в 2018 году.*

Кстати, у Джареда с Иванкой трое детей. Старшая Арабелла, к примеру, отметит 13-летие через семь лет.

Родственники зятя Дональда Трампа Джареда Кушнера родом из Новогрудка. Семья Кушнер спаслась в войну благодаря побегу из гетто и партизанскому отряду братьев Бельских. О белорусской истории своих предков Джаред Кушнер публично рассказал предвыборным летом в статье, опубликованной в газете New York Observer.

«Я внук людей, выживших в Холокосте. 7 декабря 1941 года – в день атаки на Перл-Харбор – нацисты окружили гетто в Новогрудке и разделили его жителей на две группы. Те, кто должен был умереть, направо; те, кто пока останется в живых, – налево. Эсфирь, сестра моей бабушки, попыталась спрятаться в здании. Мальчишка, который увидел, как она убегала, выволок ее оттуда, и она оказалась в числе примерно 5100 новогрудских евреев, убитых в этой первой резне. В 1943 году в ночь перед еврейским новым годом 250 человек, что остались из 20-тысячного еврейского населения Новогрудка, задумали бежать через вырытый ими подземный тоннель, уходящий за ограду. Они вывели из строя прожекторы и вынули гвозди из кровельного железа, чтобы оно гремело на ветру и заглушало звуки побега», – рассказал зять Дональда Трампа.

До войны Кушнеры жили в Новогрудке. Глава семейства Зейдель имел собственную мастерскую и магазин, где продавал меховые изделия, в том числе шапки, поэтому, как утверждают краеведы, получил в местечке прозвище «шляпник».

С приходом немцев семья Кушнер оказалась в Новогрудском гетто. Бежать узники решили после очередного массового расстрела. Три месяца копали туннель, и 26 сентября 1943 года все до одного спустились под землю.

«Когда мы планировали побег, думали: убежим в лес. Но когда мы оказались на свободе, наступила паника. Все разбежались в разные стороны. А утром немецкая армия окружила окрестности города и часть сбежавших убила. Мы бродили 10 дней, от Рош А-Шана до Йом Кипур. Десять дней мы сидели под кустами. Шел дождь, как будто Бог забыл о нас. Мы промокли, у нас не было еды. И вот однажды нас на ночь приняла одна женщина с маленькой фермы, накормила, дала молока. А в это время Бельские уже собирали евреев. Они слышали, что евреи убежали из гетто, прислали парней с оружием и забрали нас в лес», – вспоминала бабушка Джареда Рая Кушнер.

Так более ста человек оказались в партизанском отряде братьев Бельских. Среди них были и Кушнеры: Зейдель с двумя дочерьми, Раей и Леей, и его брат Хаим. Жена Зейделя Хинда погибла в гетто, единственный сын Хоня – при побеге. В партизанском отряде Рая познакомилась с Юзефом Берковичем, но романтические отношения между молодыми людьми завязались уже после войны, в Будапеште. Там Рая и Юзеф поженились. Юзеф взял фамилию жены – Кушнер.

Чарльз Кушнер – сын Раи и Юзефа – родился уже в Америке. Он занялся недвижимостью, разбогател и стал миллиардером. Один из его сыновей, Джаред, зять Дональда Трампа, – совладелец отцовской компании и хозяин газеты The New York Observer.

Джаред закончил Гарвард, получил степень бакалавра социологии. Еще будучи студентом, он заработал на операциях с недвижимостью 20 миллионов долларов. В июле 2006 года в возрасте 25 лет он купил за 10 миллионов долларов еженедельную газету The New York Observer.

Со своей будущей женой, дочерью 45-го президента США Дональда Трампа, Джаред познакомился 9 лет назад на бизнес-ланче у брокера по коммерческой недвижимости. Иванка тоже занимается недвижимостью. Обоим было по 25 лет. Свадьбу играли в еврейской традиции – накануне торжества Иванка по просьбе Джареда приняла иудаизм. Джаред соблюдает кошрут и субботу.


Джаред – старший ребенок в семье. У него есть еще две сестры и брат. Причем его брат Джошуа известен тем, что основал венчурную компанию, которая одной из первых инвестировала в Instagram. Кроме того, Джошуа считается одним из самых завидных холостяков Нью-Йорка.

У Джареда с Иванкой трое детей. Все они в будущем могут приехать в Беларусь.

КУЛУАРЫ

Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ: «З міністрам культуры я размаўляў дзве хвіліны»

Чыноўнікі Міністэрства культуры прапанавалі знакамітаму балетмайстру Валянціну Елізар'еву ў наступным годзе шырока адзначыць 70-гадовы юбілей. Меркавалася, што юбілейны вечар пройдзе ў Акадэміі музыкі, аднак Елізар'еў прапанаваў, каб мерапрыемства адбылося на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, якому ён аддаў 35 гадоў свайго жыцця.



Цікава, што ні **Кацярына Дулава,** рэктар Акадэміі музыкі, дзе цяпер працуе Валянцін Елізар'еў, ні міністр культуры **Барыс Святлоў** ні словам не абмовіліся з нагоды ліста расійскага харэографа **Юрыя Грыгаровіча**. Як паведамляла "Народная Воля", Грыгаровіч звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай вярнуць у тэатр Елізар'ева. *«За час яго адсутнасці ў Вялікім тэатры Беларусі не было пастаўлена ні адной значнай работы ўзроўню і маштабу спектакляў Елізар'ева*, – напісаў Грыгаровіч беларускаму прэзідэнту яшчэ ў ліпені гэтага года. – *Асноўную частку новага рэпертуару балета Вялікага тэатра Рэспублікі Беларусь складаюць балетныя спектаклі, узятыя напракат або набытыя ў іншых краінах, у Расіі, у Галандыі. Сваіх нацыянальных балетных спектакляў, якія сталі б значнай падзеяй культурнага жыцця, не з'явілася».*

Міністэрства культуры павінна было сфармуляваць тэзісы для адказу на ліст Грыгаровіча. Намеснік міністра культуры **Ірына Дрыга** паведаміла, што прапановы сфармуляваны і ўсе яны былі ўзгоднены з Елізар'евым. *«Ён у курсе»*, – сказала чыноўніца. І дала зразумець, што вяртанне харэографа ў Вялікі тэатр пакуль не плануецца: *"Наш Вялікі тэатр паспяхова працуе, там ёсць кіраўнікі. Але калі Вялікі ці Музычны тэатры будуць зацікаўлены ў тым, каб прапанаваць пастаноўку Валянціну Мікалаевічу, гэтае пытанне будзе вырашацца толькі імі самімі. Ніякага ціску Міністэрства культуры ні на адзін, ні на другі бок не аказвае».*

«Спачатку ў мяне адбылася размова з рэктарам Акадэміі з нагоды юбілейнага вечара, які будзе называцца «Лінія жыцця», – распавёў Валянцін Мікалаевіч пра свае размовы з чыноўнікамі ад культуры. – *Крыху пазней адбылася размова з Барысам Святловым. З міністрам культуры я размаўляў дзве хвіліны. Гэта была вельмі кароткая тэлефонная гутарка, ён нават не прапанаваў мне сустрэцца. Размова ішла таксама выключна пра юбілей. Пра ліст Грыгаровіча гаворкі не было, ніякіх прапаноў Міністэрства культуры са мной ніхто не ўзгадняў».*


Што ж, паглядзім, які адказ атрымае на свой зварот Юрый Грыгаровіч. Не выключана, што чыноўнікі, якія будуць рыхтаваць гэты дакумент, напішуць, што дзяржава Елізар'ева не забывае і нават рыхтуецца маштабна адзначыць яго юбілей. Гэта ж таксама мастацтва – умела і своечасова пусціць пыл у вочы...

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

БЕЗ ГАЛСТУКА

Леонид Крупец адаптировался к тропикам

Но экс-главе Минского облисполкома теперь приходится заново привыкать к белорусскому климату.



Напомним, что пять лет Крупец провел в Бразилии: в 2011 году он был назначен Чрезвычайным и Полномочным Послом. От должности его освободили летом этого года.

Сейчас бывший вице-спикер Совета Республики все еще в отпуске, который проводит в своем родном Несвижском районе. После Бразилии Крупцу в Беларуси, конечно, холодновато.

«За пять с половиной лет, проведенных в Бразилии, организм капитально адаптировался к местному тропическому климату, – говорит бывший чиновник. – *Представьте, 1200 километров от океана, 1300 метров – высота над уровнем моря. Не хватало влаги. Практически сплошное лето – шесть месяцев без дождей. Правда, еще шесть – с дождями… Но ничего, в родных местах все равно лучше. Конечно, скучали по нашей природе. Не хватало смены времен года. И домой тянуло…»*

Буквально на днях Леонид Крупец отметил 60-летний юбилей. У него двое взрослых сыновей, есть внуки.

«Жизнь складывается неплохо», – говорит он.

Вера ВИР.

НА СУСТРЭЧУ!

Маці 18 дзяцей з Барселоны прэзентуе ў Беларусі сваю кнігу



Сям'я Пастыга-Пік.

24–26 лістапада ў Беларусі будзе знаходзіцца іспанка Роза Пік, маці 18 дзяцей. У Мінску і Гомелі яна разам з мужам Хасэмарыя Пастыгам прэзентуе кнігу «Як быць шчаслівым, маючы 1, 2, 3... дзяцей» у перакладзе на беларускую мову. Акрамя гэтага, пройдзе прэзентацыя курсаў міжнароднай Акадэміі сям'і.

У сям'і Пастыга-Пік 18 дзяцей, іспанская сямейная пара – самая шматдзетная ў Еўропе з дзецьмі школьнага ўзросту.

51-гадовая Роза нядаўна выпусціла кнігу, у якой з гумарам расказвае пра сваё жыццё і на асабістым досведзе паказвае, як быць шчаслівым у сям'і.

У 2016 годзе кнігу пераклалі на беларускую мову і выпусцілі ў Мінску. Пераклад з іспанскай зрабіла Юлія Шадзько, над тэкстам таксама працавала Анхела Эспіноса, іспанка, якая вывучыла беларускую мову і нават піша вершы па-беларуску.

Кніга шматдзетнай маці з Іспаніі перакладзена на 11 моў.

Хасэмарыя і Роза шмат вандруюць – як у сувязі з бізнесам Хасэмарыя (ён займаецца імпартам мясной прадукцыі і з'яўляецца пасрэднікам у здзелках з нерухомасцю), так і працай Розы (у індустрыі моды), а таксама ў якасці мадэратараў IFFD – Міжнароднай федэрацыі развіцця сем'яў, якая была створана ў 1978 годзе ў Іспаніі. З таго часу больш як у 60 краінах IFFD праводзіць курсы для сямейных пар, канферэнцыі, кангрэсы, навучанне, даследаванні. Заснавальнікам IFFD быў Рафаэль Пік, бацька Розы.

Фота diariodenavarra.es

ГАСТРОЛЬ



Лара Фабиан попросила мятный чай и куриные грудки

30 ноября в Минске во Дворце спорта выступит известная бельгийская певица Лара Фабиан. «Народная Воля» изучила райдер артистки.

Как оказалось, Лара Фабиан тщательно подходит к выбору еды и напитков. Она и в интервью не раз признавалась в том, что склонна к полноте и вынуждена придерживаться строгой диеты. Поверить в это, конечно, очень сложно, ведь артистка всегда в отличной форме.

Однако требования райдера говорят сами за себя. От кухни отеля Лара требует свежие фрукты, куриное филе, цельнозерновой рис, зеленые овощи: брокколи, цуккини и спаржу. При этом все, что попадает на стол певице, должно быть приготовлено на пару.

Лара любит кофе и травяные настои, за исключением ромашкового. И часто пьет натуральный мятный чай без добавления зеленого и черного. Это строгое требование артистки, оно особо оговаривается сразу в нескольких местах, подчеркивают организаторы. Пакетики с мятой должны быть в наличии не только в номере, но и в гримерке певицы. А еще Лара – сторонница безглютенового питания и исключает из рациона продукты из коровьего молока. Поэтому организаторы должны позаботиться о наличии безглютеновых хлопьев и хлебцов, а также рисового или миндального молочка.

А вот команда Лары Фабиан куда менее требовательна. Из пожеланий – лишь обязательное наличие за столом фруктов и овощей и хороший выбор горячего, в котором обязательно должны присутствовать мясные, рыбные и вегетарианские блюда.

В райдере прописано, что команде артистки должны быть предоставлены три гримерки. Одна из них, самая оснащенная (с душем, вайфаем, монитором и гримерным столом), предназначается Ларе. Вторая – музыкантам, третья – членам команды, куда входят инженер по звуку, костюмеры, администраторы и другие помощники. Тут требования самые традиционные: стандартные наборы гигиенических принадлежностей от полотенец до салфеток, свежие фрукты, напитки.

Но самое ответственное для организаторов – выполнить технический райдер певицы. Ведь оценивать профессиональный уровень артиста зрители будут по качеству звука. Лара Фабиан ожидает, что все пространство должно быть заполнено звуком. В зале, как говорят специалисты, ничего не должно «проседать» или «выпадать». Мониторы должны покрывать пространство всей сцены, чтобы музыкантам и артисту играть на ней было комфортно. Это составляет львиную долю успеха шоу.

Разумеется, в команду сопровождающих Фабиан входит свой звукоинженер, и ему должен быть обеспечен доступ ко всей технике. Именно он в конечном счете отвечает за техническое обеспечение хорошего звука на сцене и в зале. А это – основное условие той особой интимной атмосферы взаимодействия певицы и публики, которая рождается на каждом концерте Лары.

Интересная деталь, которая свидетельствует о высочайших требованиях к звуку, выверенных многолетним опытом артистки и ее звукорежиссеров: в техническом райдере Лары отдельно оговорено, что модели микрофонов самой артистки и бэк-вокалистов не могут быть заменены аналогами ни при каких обстоятельствах. Нарушение этого условия может привести даже к расторжению договора и отмене шоу.

Кстати, билеты на концерт Лары Фабиан стоят от 40 до 230 белорусских рублей.

Алина ВЕТРОВА.

ВІНШУЕМ!

Эрнест ЯЛУГІН: «Калі аддаешся пісьменніцкай справе – аж калоціць цябе!»

Некалькі дзён таму 80-годдзе адзначыў вядомы беларускі пісьменнік Эрнест Ялугін. "Народная Воля" далучылася да шматлікіх віншаванняў.



З асабістай справы

Эрнест Ялугін нарадзіўся 19 лістапада 1936 года на станцыі Асінаўка Аршанскага (цяпер у складзе Дубровенскага) раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага. Дзіцячыя гады прайшлі на радзіме бацькоў – у Крычаве. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1954) стаў літсупрацоўнікам пры крычаўскай раённай газеце «Шлях сацыялізма», з 1955 г. – літсупрацоўнік гэтай газеты. Працаваў у мсціслаўскай раённай газеце «Калгасная праўда» (1957–1960), у шматтыражцы «За коммунистический труд» (Салігорск). Скончыў завочна аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1962).

З 1961 г. – літсупрацоўнік, загадчык аддзела, адказны сакратар газеты «Знамя юности», з 1966 г. – раз'язны карэспандэнт «Сельской газеты», у 1969–1972 гг. – карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва». З 1976 г. – супрацоўнік часопіса «Нёман», у 1978–1984 гг. – намеснік галоўнага рэдактара. З 1990 г. – рэдактар газеты «Наша слова».

Сябра СП СССР з 1972 года.

Аўтар аповесцяў «Камни Млечного пути», «Мстиславцев посох», «Сіндбад вяртаецца», «Без эпітафіі», «Только камни» і іншых.

– Я нават і не чакаў, што будзе столькі званкоў – некалькі дзясяткаў! – *падзяліўся прыемнымі эмоцыямі Эрнест Васільевіч.* – Тэлефанавалі нават тыя, каго я не надта добра ведаю. Прычым неяк жа знайшлі мяне! Я быў шчыра здзіўлены, бо якраз нядаўна хатні нумар змяніўся.

Паштоўкі таксама дасылалі. І Саюз пісьменнікаў павіншаваў, хаця ў мяне з некаторымі кіраўнікамі складаныя адносіны былі... Прыемна, нічога не скажаш! Спачатку даслалі стандартную паштоўку з агульнымі віншаваннямі. А на наступны дзень з'явілася дэлегацыя ад кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў з найпрыгажэйшым букетам белых руж і віншавальным адрасам за подпісам Барыса Сачанкі (Пятровіча), дзе сярод іншага напісана: *"Ваша шматгадовая пісьменніцкая і журналісцкая дзейнасць несумненна заслугоўвае высокіх адзнак і з'яўляецца выдатным прыкладам працы на карысць беларушчыны. Напісаныя вамі кнігі паспрыялі развіццю жанру нацыянальна-гістарычнай прозы, сталіся важкім унёскам у скарбніцу беларускай літаратуры, набылі вядомасць і прызнанне ў чытача. Зычым вам доўгіх гадоў жыцця, моцнага здароўя, натхнення і творчых поспехаў!"*

Шчыра кажучы, у мяне аж настрой змяніўся!

– А як дома адсвяткавалі?

– Паколькі ў мяне не вельмі добра са слыхам, дык стараўся трымацца бліжэй да тэлефона, каб чуць званок. Але, шчыра кажучы, у мяне ўсё ж хваравіты настрой, не зусім святочны. Справа ў тым, што не дае пакою моцная арытмія, трапіў у бальніцу, мне шмат таблетак давалі. І сапсавалі стрававальную сістэму. Нажыў сабе новую хваробіну – запаленне стрававода, а адсюль моцны выкід салянай кіслаты. Яна, здаецца, спальвае мне не толькі страўнік, але і мазгі! З-за гэтага нават працуецца горш. Напісаў п'есу, якая, на маю думку, выдатна адлюстроўвае час. Цяпер раблю нейкія рэдагаванні, запісы, а як моташна становіцца, дык перадых даю. Вось такое творчае ў мяне жыццё цяпер... *(Усміхаецца.)*

– Эрнест Васільевіч, калі не памыляюся, вы ўжо не адзін год халасцякуеце...

– Так, у маёй жонкі быў рак страўніка. Я пасля яе сыходу п'есу напісаў "Святло прадоння": пра тое, што з бездані на нас ліецца святло, але гэта пекла...

Жонка памерла на маіх руках. Я вельмі перажываў, быў побач да яе апошняй хвіліны. А потым думаў: Божа мой, чаму чалавек, які сыходзіць у такіх невыносных пакутах, не можа прыняць нейкую таблетку, каб заснуць і не прачнуцца? У некаторых краінах нават спецыяльныя законы на гэты конт прымаюць. А ў нас, аказваецца, невылечна хворыя дастаткова не забяспечаны лекамі, якія змяншаюць гэты страшэнны боль. Вось і мая жонка моцна пакутавала да самага канца. Ёй зрабілі аперацыю, але пасля гэтага таксама ж мучэнні былі... Я потым праз знаёмых здабываў моцныя абязбольваючыя для яе. Ну хіба гэта нармальна? Трэба, каб людзі па-чалавечы паміралі...

– Чаму, калі не сакрэт, больш не ажаніліся?

– Не мог уявіць побач з сабой іншую жанчыну, разумееце?..

…Нейкае такое адчуванне было, што гэта будзе здрада жонцы...

…Адна жанчына мне казала: "Эрык, ну ты зразумей, яе больш няма!.."

…А для мяне яна ёсць. У душы ёсць...

Літаратары ўсе свае пачуцці перакладаюць на паперу. І я пішу. Апошні раман напісаў – кажуць, выдатны, некаторыя кажуць – геніяльны *(усміхаецца)*. Хоць я сябе геніем не лічу, але ж майстэрства нейкае маю. Нават Ніл Сымонавіч Гілевіч гэта адзначыў – ён напісаў ліст да адной з маіх кніг. Мяне гэта вельмі кранула і парадавала.

– Эрнест Васільевіч, а пра што вы сёння марыце?

– Ну, пра тое, каб вызваліцца ад сваіх балячак, нават і казаць не буду – гэта само сабой.

Мару, каб мае творы моладзь чытала. Асабліва гэта тычыцца кніг "Ідзі і кажы", "Без эпітафіі", "Перад патопам". Бо там укладзена даволі багата таго, што трэба нам для душы, культуры, самаразвіцця, адчування сябе беларусам. Здаецца, дасціпна напісана. Добра, каб гэтае засталося...

А я свой век ужо заканчваю.

– Ну, 80 – гэта яшчэ не фініш.

– Так, аднак я нутром адчуваю...

Калі працаваў над апошняй кнігай "Перад патопам", дык літаральна надарваўся. Адчуваў, што, магчыма, хутка ўсё скончыцца, дык і днём пісаў, і ноччу. Пакуль сэрца не сарвалася...

Але пакуль сэрца яшчэ б'ецца – буду пісаць, хоць, разумею, што да канца справу давесці не атрымаецца. Бо, калі аддаешся пісьменніцкай справе – аж калоціць цябе! Каб пісаць, патрэбна сіла, а адкуль яна ў мяне, 80-гадовага? Я ўвогуле дзіўлюся, як да гэтага часу дажыў...

Мне быццам як прырода на вуха шапнула: вось гэта ты павінен зрабіць, павінен дапісаць. І я раблю. Спадзяюся, спатрэбіцца.

Марына КОКТЫШ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Што скажуць эксперты?

Псіхолага-псіхіятрычная экспертыза 17-гадовага Уладзіслава Казакевіча, які напаў з бензапілой і сякерай на людзей у мінскім гандлёвым цэнтры «Новая Еўропа», прадоўжана.

Нагадаем, 8 кастрычніка хлопец з бензапілой і сякерай напаў на работнікаў і наведвальнікаў гандлёвага цэнтра. У выніку адна жанчына загінула, дзве атрымалі траўмы.

Як паведаміла ўчора афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі **Юлія Ганчарова**, зараз устанаўліваюцца ўсе абставіны здарэння. Следчыя атрымалі паказанні больш як 100 сведак, далучаны да матэрыялаў справы і прааналізаваны вынікі звыш 30 экспертных даследаванняў.

«У мэтах паглыбленага вывучэння асобы падазронага і матываў учыненага злачынства правядзенне стацыянарнай комплекснай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы прадоўжана. Мера стрымання застаецца ранейшай – зняволенне пад варту», – распавяла прадстаўніца Следчага камітэта.

ИНТИМНАЯ ТЕМА



Игорь МИКУЛИЧ, уролог: «Каждый раз жалеешь только об одном – об упущенном времени»

Какие анализы обязательно нужно сдавать каждому мужчине раз в год? На какие симптомы нужно обращать внимание, чтобы после праздников не оказаться в больнице? Как не прозевать рак предстательной железы?

О мужском здоровье «Народной Воле» рассказал ***уролог медицинского центра «ЛОДЭ» Игорь МИКУЛИЧ.***

– Игорь Николаевич, как часто мужчина в возрасте за 40 должен посещать уролога?

– Мы рекомендуем пациентам – даже тем, у кого нет явных жалоб на здоровье, – посещать врача-уролога раз в год. Ежегодно мужчина должен сделать УЗИ почек, мочевого пузыря с остаточной мочой и предстательной железы. Сдать общий анализ крови и мочи и биохимический анализ крови, который включает такие показатели, как холестерин, мочевина, креатинин, глюкоза крови. Обязательно также контролировать уровень ПСА.

Еще по показаниям мы рекомендуем своим пациентам проходить скрининг на половые гормоны, гормоны щитовидной железы, а также выполнить исследование секрета предстательной железы.

– Обыватели часто думают, что ПСА – это болезненный анализ, требующий забора материала из предстательной железы…

– Пациенты нередко вообще не знают, что такое ПСА. Они меняются в лице, когда врач расшифровывает, что простатический специфический антиген – это онкомаркер рака простаты. Но ПСА – метод диагностики рака предстательной железы на ранних стадиях, когда пациента можно полностью излечить.

Вопреки заблуждениям обывателей ПСА-анализ выполняется достаточно просто. Надо утром натощак прийти в процедурный кабинет и сдать кровь из вены. Однако следует помнить, что за сутки до сдачи исследования мужчина должен воздержаться от половых контактов.

Поскольку ПСА является методом отбора для дальнейшего обследования на наличие рака простаты, то дополнительно пациенту проводится трансректальное УЗИ предстательной железы, биопсия простаты и обязательное пальцевое исследование, которое выполняет врач-уролог на приеме.

– В каком возрасте обычно дает о себе знать доброкачественная гиперплазия предстательной железы?

– Средний возраст пациентов с аденомой простаты – 50–60 лет. Доброкачественная гиперплазия предстательной железы может «заявить» о себе даже в 40 лет.

– И с чем это может быть связано?

– Это зависит от скорости роста предстательной железы, от гормонального фона, от сопутствующих заболеваний: андрогенный дефицит, сахарный диабет, хронический простатит, ожирение.

– Какими симптомами проявляет себя аденома простаты?

– Как правило, обструктивными и ирритативными. Обструкция может быть связана с механическим сдавливанием простатического отдела уретры, и тогда мужчина отмечает у себя ослабление напора или раздвоение струи мочи. Ему приходится напрягать пресс, чтобы опорожнить мочевой пузырь.

Ирритативные симптомы обычно связаны с нарушением регуляции функции мочевыделительных органов. Это частые позывы к мочеиспусканию, которые человек порой не в состоянии сдерживать, ночные походы в туалет. Если мужчина встает с постели хотя бы один раз за ночь – это уже отклонение от нормы.

– То есть он в принципе не должен вставать ночью?

– Не должен. Если мужчина просыпается, чтобы посетить туалет, значит, мы можем говорить, что у него наблюдаются первые симптомы нижних мочевых путей. Это должно насторожить и заставить обратиться за консультацией к урологу.

Но, к сожалению, мало кто из пациентов обращается к урологам на ранних этапах, когда консервативное лечение наиболее эффективно. Чаще всего больные приходят к нам тогда, когда у них уже развивается хроническая задержка мочи – ишурия. Если мочевой пузырь не опорожняется полностью, объем остаточной мочи со временем возрастает – и в какой-то момент на фоне приема алкоголя или соленой пищи в течение нескольких часов может развиться полная задержка мочи. Так часто и бывает: человек годами не обращается к урологу с беспокоящими его симптомами, а потом отпразднует Новый год или юбилей – и следующее утро встречает в приемном отделении больницы.

– Правда ли, что рак простаты может годами не выдавать себя?

– К сожалению, более чем в 90% случаев рак предстательной железы ничем себя не проявляет. Пациенты прислушиваются к себе, ждут каких-то «звоночков», они уверены, что организм сразу отреагирует и пошлет им сигнал SOS. Но на самом деле жалобы появляются, когда вопрос стоит уже не об излечении, а всего лишь о продлении жизни. Именно поэтому мы так настойчиво рекомендуем мужчинам почтенного возраста не пренебрегать ежегодными визитами к врачу-урологу. Время – наш самый ценный ресурс, поверьте: его нужно тратить на заботу о собственном здоровье. Когда видишь пациентов, попавших в сложную жизненную ситуацию, каждый раз жалеешь только об одном – об упущенном времени.

Ася КАЛИТИНА.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Бясплатныя прышчэпкі ад грыпу – беларускай вытворчасці

Да снежня медыкі рэкамендуюць зрабіць прышчэпку ад грыпу.

– Як і ў папярэднія гады, прышчэпкі будуць праводзіцца і на бясплатнай, і на платнай аснове, – *распавядае загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі ГУ «Брэсцкі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя»* ***Святлана Карповіч.*** – У першую чаргу за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў будуць прышчапляцца асобы, якія належаць да груп падвышанай рызыкі развіцця постгрыпозных ускладненняў і захворвання на грып.

За кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў будуць у першую чаргу прышчапляцца дзеці, якія наведваюць установы адукацыі, і работнікі гэтых устаноў.

У бягучым годзе для масавай вакцынацыі насельніцтва закуплена вакцына «Грыпол плюс Белмед» вытворчасці Рэспублікі Беларусь. Для платнай імунізацыі арганізацыямі аховы здароўя акрамя вакцыны «Грыпол плюс Белмед» будуць выкарыстоўвацца вакцыны «Ваксігрып» (Францыя) і «Інфлювак» (Нідэрланды).

У Беларусі да вакцын прад'яўляюцца такія ж патрабаванні, як і да лекавых сродкаў. Усе вакцыны, якія выкарыстоўваюцца пры правядзенні кампаніі вакцынацыі ў Рэспубліцы Беларусь, праходзяць абавязковую дзяржаўную рэгістрацыю і кантроль якасці.

Прапанаваныя вакцыны не ўтрымліваюць жывы вірус грыпу, а толькі яго асобныя часцінкі (вонкавыя і ўнутраныя антыгены віруса грыпу), якія і неабходны для фарміравання абароны супраць грыпу ў арганізме чалавека. У склад вакцын ўваходзяць 3 штамы віруса грыпу, найбольш актуальныя для дадзенага эпідсезона. Яны з'яўляюцца высокаачышчанымі прэпаратамі, добра пераносяцца дзецьмі і дарослымі.

Грыпозныя вакцыны ў насаглотцы фарміруюць мясцовы імунітэт, які блакіруе размнажэнне рэспіраторных вірусаў на слізістых абалонках. За кошт гэтага эфекту, а таксама дзякуючы стымуляцыі клеткавага імунітэту ў прышчэпленых фарміруецца абарона не толькі ад грыпу, але і ад іншых рэспіраторных вірусных інфекцый.

Вакцынацыю супраць грыпу праводзяць восенню, з тым каб да пачатку эпідсезона ў прышчэпленага чалавека мог выпрацавацца імунітэт. На працягу 2–3 тыдняў пасля вакцынацыі сфарміруецца ахоўны ўзровень антыцел супраць вірусаў грыпу, які забяспечвае абарону ад захворвання на грып да 9 месяцаў.

Сезонны ўздым захворвання на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі адбываецца ў Беларусі звычайна ў студзені–сакавіку.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Наталья ПРОКОПЕНКО:
«Хочу вернуться в Минск…»

Супруга легендарного белорусского футболиста Александра Прокопенко, которая последние 17 лет живет в США, – о прошлом и настоящем.



Справа налево: легендарный футболист минского "Динамо" Юрий Пудышев, Наталья Прокопенко, ее сестра София и Дмитрий – сын Александра и Натальи Прокопенко.

…Мы встречаемся в кафе футбольного клуба «Минск» в день рождения выдающегося игрока «Динамо». Ему исполнилось бы 63. Последний раз Наталья приезжала в Беларусь 5 лет назад, но сейчас повод побывать на родине серьезный – 19 ноября в Минске состоялся благотворительный футбольный матч памяти Александра Прокопенко. Все собранные средства пойдут на развитие проекта «Народный футболист».

Есть что сегодня вспомнить и Наталье Никифоровне…

– Я выросла в многодетной семье – у родителей было шестеро детей, – рассказывает она. – Мы с Софией, кстати, двойняшки. Софа старше на три минуты, получается, что я была самая младшая. Как говорят, поскребыш. Впрочем, родители всех любили одинаково, да и старшие помогали нас на ноги поднимать. Папа работал бригадиром, кладовщиком, а если бы было образование, мог стать и председателем колхоза. Но… Есть такое выражение: он не был человеком своего времени.

А мы с Софией поступили в Бобруйске в техникум, где я и познакомилась с Сашей. Это была случайность, но, как известно, чудеса в жизни бывают. Просто с сестрой вдвоем шли по коридору, навстречу – он. Это была любовь с первого взгляда…

– Ваши первые впечатления?

– Юморной, остряк, душа компании. Мог так «закрутить» рассказ, что не поймешь, где правда, а где нет. Правда, у Саши была одна большая проблема – он заикался. Когда был совсем маленьким, родители делали в доме ремонт, и на него случайно упал стол. Ребенок очень сильно испугался, стал заикаться. Его мама, Ольга Савельевна, к кому только не обращалась – и к врачам, и к бабкам-шептухам… Ничего не помогало. И это стало проблемой его жизни, комплексом. Я 15 лет была с ним рядом, видела, как ему было тяжело с этим жить. Иногда даже ребята из команды говорили: «Тихо! Прокоп ругается». Мол, нужно послушать и не перебивать.

Но кавалер он был великолепный. Галантный, всегда дарил цветы и пластинки. А сколько писем писал! Даже из Минска, когда его пригласили в «Динамо», а я оставалась в Бобруйске. Кстати, с переездом тоже была связана любопытная история. Нужно было уже ехать в команду, но у Саши воспалилось горло. Ольга Савельевна не знала что делать, а он, чтобы быстрее выздороветь, начал полоскать горло… керосином. И поехал.

– Затем было знакомство с родителями, свадьба…

– Смешно вспоминать, но заявление в загс мы относили с отцом Саши, потому что сам он уехал на сборы в Грузию. Там сначала немного удивились, когда увидели моего пожилого «жениха», но затем, к общему веселью, разобрались. Кстати, кольцо выбирала в этой же компании – с папой.

А свадьбу сыграли 20 июля 1974 года в Бобруйске, в родительском доме Саши. У меня было шикарное платье, красивая фата, диадема… На торжестве присутствовало человек сто гостей. Но сразу же после свадьбы муж улетел на матч в Кемерово. Возвращается через пару дней, лицо прячет. «Покажи, – говорю, – что случилось?» А у него полностью разорвана щека! Тогда за «Кузбасс» играли братья Раздаевы, один из них и сделал «подарок к свадьбе».

– По гороскопу и вы, и ваш супруг – Скорпионы. Как уживались в семейной жизни – знак-то «кусачий»?



– Вот так и уживались. Как только поженились и переехали в Минск, нам сразу же от клуба дали двухкомнатную квартиру на Багратиона. Саша играл, я работала в Белорусском технологическом институте…

Муж очень много подарков дарил, первые привез из английского Ноттингема – города-побратима Минска. Когда сын родился, и его щедро одаривал. Димка ходил, как кукла, а в детском саду воспитательница мне говорила: «Боже, Наталья Никифоровна, вы так балуете сынишку!»

Помню, после родов Саша вместе со своей мамой пришли ко мне в 6-ю больницу. Первый его вопрос был: «Что нужно купить сыну?» Ольга Савельевна тогда посмеялась: «Не конфеты же. Пойдем, дома расскажу, что нужно. Коляска, кроватка…" Он был очень добрый. Про это почему-то меньше говорят. Больше про то, что выпивал…

– Тяжело быть женой кумира болельщиков?

– Когда ходили на концерты, на нас оглядывались и говорили: «О-о, Прокопенко идет!» Узнавали, иногда просили пропуск на футбол…

Но одновременно я прошла и через очень большие испытания. Это была человеческая беда, трагедия, но я хочу, чтобы в памяти болельщиков в первую очередь остался футболист Александр Прокопенко. Трудяга, талант… Потому что Саша футболом просто жил. Без него он не был человеком. И, когда мужа отчислили из минского «Динамо», это его подрубило на 50 процентов. А может, и больше. Он потерялся, казалось, что его бросили, как мусор.

– И вечером 29 марта 1989 года Александр Прокопенко трагически погиб…

– Я тогда приболела, Димка был на каникулах у моих родителей. Вечером выпила таблетки, утром проснулась – мужа дома нет. И телефонный звонок: «Саша умер». Я сразу Софье позвонила, Сашиным родителям… Пошла в «Динамо», затем отправилась в морг 9-й больницы. Помнится, иду и открываю одну дверь, вторую, третью… Лежит Саша. Привезли его вечером, Ольга Савельевна сразу на колени…

Через три года похоронили и маму Саши, она тоже ушла очень рано – в 65 лет. Чуть позже умер отец и два брата мужа. Так что сейчас все лежат на одном кладбище.

– Вы ведь после этого не сразу решили в Америку уехать?

– Не было таких планов, но здесь дело случая: мы с Димой выиграли «зеленую карту». Первые дни в США приходилось очень непросто. Незнание английского языка, другой менталитет. Морально было сложно, потому что мы оказались совершенно в другом мире. Другие условия жизни, другая ментальность… А потом понемногу привыкла, втянулась.

– С чего вы начинали в Америке?

– Я попала на работу в социальную службу по уходу за пожилыми людьми. И проработала там около 15 лет. Сейчас оформила пенсию, так что могу жить на две страны.

– Живете в Нью-Йорке?

– Да, в Бруклине. Но, честно говоря, чувствую себя там не очень комфортно. Бруклин – специфический район.

– Чувствуете себя уже американкой?

– Не чувствую, потому что Нью-Йорк – это не США. Это место, где оседают эмигранты, город иначе еще называют «воротами в Америку».

– На президентских выборах кому отдали голос – Хиллари Клинтон или Дональду Трампу?

– Так получилось, что я вообще не голосовала, но поддерживаю Трампа. Хотя у них там, как говорят, своя кухня и своя каша, так что и без меня хватает аналитиков. Тем более что я люблю свою страну и мечтаю вернуться в Минск на постоянное место жительства. Здесь моя родина, здесь похоронен мой муж…

Алесь СИВЫЙ.

Фото автора и из семейного архива семьи Прокопенко.

З НАГОДЫ



Алесь СІВЫ

Гульня на мільёны

Усе людзі ў нас, як вядома, бліскуча разбіраюцца ў спорце і ў палітыцы. Яны добра ведаюць, чаму не перамагае футбольная зборная Беларусі, не даюць спуску хакейнаму кіраўніцтву за лядовыя палацы і адсутнасць вынікаў, а таксама ў дэталях могуць разабраць расійска-ўкраінскі канфлікт альбо перамогу Дональда Трампа ў Злучаных Штатах. Спартыўных аналітыкаў і палітолагаў у нас – мільёны.

Навіна, што ў 2019 годзе ў Беларусі пройдуць Еўрапейскія гульні, таксама не засталася па-за ўвагай. Пры гэтым галоўнае пытанне, якое хвалюе сёння грамадскасць: патрэбны нам такія гульбішчы падчас крызісу ў эканоміцы альбо не? І вось тут меркаванні падзяліліся.

Па-першае, алею ў агонь лінула інфармацыя аб тым, што першыя Еўрапейскія гульні, якія прайшлі ў Баку, абышліся Азербайджану ў 5 мільярдаў долараў, хаця афіцыйны бюджэт складаў мільярд "зялёных". Толькі на адкрыццё было патрачана каля 100 мільёнаў долараў. І сумы, трэба сказаць, не маглі не шакіраваць!

Праўда, беларускія кіраўнікі паспрабавалі суцешыць хваляванні народа. Напрыклад, памочнік прэзідэнта па справах фізкультуры і спорту Максім Рыжанкоў абвясціў, што спартыўнае мерапрыемства будзе каштаваць "некалькі мільёнаў долараў". Міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко паведаміў у эфіры АНТ, што правядзенне Гульняў абыдзецца ў 30–40 мільёнаў. А днямі выказаў сваё меркаванне з гэтай нагоды і кіраўнік краіны: *«Мы палічылі, што нават у плюсе будзем. Нам трэба будзе выдаткаваць недзе пад 50 мільёнаў долараў за гэтыя гады. Гэта слёзы для краіны. А можа, і таго не трэба: еўрапейцы сказалі, што дапамогуць».*

Разлік у чыноўнікаў просты. Маўляў, спартыўная інфраструктура ў нас ужо ёсць, а многія выдаткі возьмуць на сябе Міжнародны і Еўрапейскі алімпійскія камітэты. Пра тое, чаму не захацела быць у плюсе Галандыя, якая раней збіралася праводзіць Гульні, чамусьці не паведамляецца. Хаця ёсць інфармацыя, што адмовіліся галандцы менавіта пасля вывучэння грамадскага меркавання і падліку фінансавых выдаткаў. Але гэта ўжо іх праблемы, калі яны "не ўмеюць" правільна лічыць і зарабляць грошы.

Услед за "галандскім дэмаршам" песімістычна выглядаюць і заявы беларускіх незалежных эканамістаў, якія таксама чамусьці не вераць у эканамічны эфект ад гэтага спартыўнага праекта. Напрыклад, Яраслаў Раманчук упэўнены, што *"выдаткі будуць большымі ў разы, і з вялікай доляй верагоднасці можна прагназаваць, што акажамся ў мінусе. Пытанне толькі ў даўжыні гэтага мінуса і ў яго глыбіні для беларускіх падаткаплацельшчыкаў"*.

Леанід Заіка наогул лічыць, што падчас падрыхтоўкі такіх мерапрыемстваў вельмі добра могуць "распілаваць" бюджэтныя і іншыя сродкі. І мяркуе, што калі ў краіне знойдзецца чалавек, які скажа, што ён усё арганізаваў па каштарысе, то яму адразу ж трэба даваць званне Героя Беларусі.

І эканаміст мае рацыю. Успомніце, у якую помпу вылілася арганізацыя чэмпіянату свету па хакеі-2014. Ніхто не кажа, што мерапрыемства прайшло дрэнна, але і накралі тады добра. У 2013-м следчыя заяўлялі пра чарговую гучную справу – кіраўнікі вядучых будаўнічых прадпрыемстваў, аказваецца, будавалі сабе катэджы за лік сродкаў, якія накіроўваліся на будаўніцтва лядовага палаца "Чыжоўка-Арэна"…

Не так даўно быў суд над былым генеральным дырэктарам хакейнага мінскага "Дынама" Максімам Суботкіным, і зноў усплыла тэма "шэрых" схем адмывання грошай падчас арганізацыі хакейнага першынства. І гэта, напэўна, толькі бачная частка айсберга. А што хаваецца пад вадой?! Адным словам, можна толькі здагадвацца, хто пры правядзенні такіх фэстаў застаецца ў плюсе.

А большасці людзей, як мне падаецца, гэтыя "гульні на мільёны" да лямпачкі. Пазіцыя ў іх простая: ад мяне тут нічога не залежыць. Хіба што ў віртуальнай прасторы праяўляюцца гэтыя палітолагі. Як пішуць некаторыя: "То падатак новы ўводзім, то пенсіённы ўзрост павышаем, то да Міжнароднага валютнага фонду звяртаемся з працягнутай рукой, а затым – р-раз! – і Еўрапейскія гульні!"

З надыходзячым вас спартыўным святам, таварышы!

ФУТБОЛ

«Шахцёр» і «Дынама» падзялілі серабро і бронзу

У мінулыя выхадныя адбыліся матчы 29-га тура чэмпіянату Беларусі.

Вось іх вынікі: "Віцебск" – БАТЭ – 2:1, "Крумкачы" (Мінск) – "Дынама" (Брэст) – 0:0, "Граніт" (Мікашэвічы) – "Мінск" – 0:7, "Нафтан" (Наваполацк) – "Белшына" (Бабруйск) – 2:2, "Слуцк" – "Нёман" (Гродна) – 0:0, "Дынама" (Мінск) – "Іслач" (Мінскі раён) – 1:0, "Шахцёр" (Салігорск) – "Славія" (Мазыр) – 5:1, "Гарадзея" – "Тарпеда-БелАЗ" (Жодзіна) – 3:3.

Турнірнае становішча

Каманды	Гульні	Выйгрышы	Нічыі	Паражэнні	Мячы	Ачкі
БАТЭ	29	21	4	4	68–25	67
Шахцёр	29	17	7	5	45–19	58
Дынама (Мн)	29	15	10	4	46–27	55
Мінск	29	14	8	7	48–24	50
Тарпеда-БелАЗ	29	13	8	8	46–32	47
Віцебск	29	12	6	11	30–23	42
Іслач	29	10	8	11	33–40	38
Гарадзея	29	8	14	7	36–34	38
Дынама (Бр)	29	10	7	12	36–40	37
Крумкачы	29	9	6	14	24–38	33
Славія	29	8	8	13	32–49	32
Слуцк	29	6	12	11	22–32	30
Нёман	29	7	8	14	21–35	29
Нафтан	29	6	8	15	24–46	26
Белшына	29	5	9	15	33–44	24
Граніт	29	5	9	15	19–55	24

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Дзяніс ШУНТО:
«Усё ў нас нармальна…»

Адзін з сузаснавальнікаў футбольнай каманды "Крумкачы" распавёў, чаму клуб патрапіў у "чорны спіс" Міністэрства па падатках і зборах.

Як стала вядома, дэбютанта вышэйшай лігі ўключылі ў спіс кампаній, якія маюць запазычанасці перад бюджэтам.

"Такая сітуацыя склалася таму, што заплацілі падаткі, здаецца, на тры дні пазней неабходнага тэрміну, – патлумачыў **Дзяніс Шунто**. – *А ў астатнім усё ў нас нармальна, і заробак футбалістам выплачваем своечасова. Іншая справа, што на фінішы каманда стала горш выступаць, ды і з галоўным трэнерам трэба будзе вызначацца ў наступным месяцы. І ўвогуле, неабходна добра паварушыць мазгамі, каб удыхнуць у каманду веру ў новыя перамогі".*

Сяргей НІКАНОРАЎ.

УСМІХНІЦЕСЯ…

***

Размова двух сяброў:

– Ты хоць раз гаварыў жонцы ўсё, што пра яе думаеш?

– Гаварыў… Хочаш, шрамы на галаве пакажу?

***

За столікам рэстарана сядзяць дама і мужчына. Да іх падыходзіць афіцыянт:

– Што будзеце заказваць?

– Мне што-небудзь экзатычнае з морапрадуктаў.

– Як наконт каракаціцы?

– А яна няхай сама сабе выбірае.

Рэкламны аддзел:
narodnayav@gmail.com
тэл.: +375 29 8 444 725, +375 29 111 30 77, +375 17 328-66-09

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
nvonlineinfo@gmail.com http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 21.11.2016 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 24 020 экз. Заказ № 4349

9 772071 964000 16091